Таццяна МЕЛЕХАВА

# Змены ў новым каменным веку на беларускіх землях

*Гісторыя Беларусі, VI клас*

*Першы раздзел "Беларускія землі ў старажытныя часы" насычаны тэарэтычным матэрыялам, які ўжо вывучаўся ў пятым класе ў курсе сусветнай гісторыі. Таму настаўніку мэтазгодна арганізаваць вучэбную дзейнасць вучняў па больш грунтоўным засваенні тэарэтычнага і адпаведнага факталагічнага матэрыялу. Адным з варыянтаў прадуктыўнай арганізацыі вучэбнага працэсу з'яўляецца прапанаваная метадычная распрацоўка ўрока, асновай якой з'яўляецца запаўненне тэматычнай структурна-лагічнай схемы.*

**Мэта ўрока:** плануецца, што ў выніку вывучэння тэмы вучні будуць ведаць прычыны пераходу насельніцтва Беларусі ад прысвойвальнай да вытворчай гаспадаркі.

**Задачы ўрока:** плануецца, што ў выніку вывучэння тэмы *вучні будуць ведаць і разумець:* паняцці: вытворчая гаспадарка, ляднае (падсечна-агнявое) земляробства, ворыўнае земляробства, родавая абшчына, расслаенне грамадства; працэс з'яўлення і развіцця на тэрыторыі Беларусі жывёлагадоўлі і земляробства; прычыны ўзнікнення расслаення грамадства і хатняга рабства; асаблівасці развіцця старажытнага мастацтва; *вучні будуць умець:* працаваць з тэкстам вучэбнага дапаможніка, афармляць вучэбны матэрыял у структурна-лагічную схему.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу.

**Сродкі навучання:** Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст.: вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : у 2 ч. Ч. 1; пад рэд. Ю.М.Бохана. Мінск, 2016; гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XV ст. 6 клас: рабочы сшытак / С.В.Паноў. Мінск, 2017; Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XV ст. 6 клас: рабочы сшытак / С.М.Цемушаў. Мінск, 2017; дыдактычны матэрыял.

**План урока**

I. Арганізацыйны этап.
II. Аперацыйна-пазнавальны этап.
1. Як зарадзілася вытворчая гаспадарка.
2. З'яўленне жывёлагадоўлі.
3. Першыя земляробы.
4. Як узнікла няроўнасць у грамадстве.
5. Першыя прыклады мастацтва.
III. Этап замацавання вывучанага матэрыялу.
IV. Этап інфармавання пра дамашняе заданне.



***МЕЛЕХАВА Таццяна Паўлаўна.***

*Педагог дадатковай адукацыі Касцюковіцкага раённага цэнтра дзіцячай творчасці. Нарадзілася ў в. Гнілец Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1987 г. закончыла гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.А.Куляшова. У 1988—1993 гг. працавала настаўніцай гісторыі ў в. Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. У 1993—2015 гг. — настаўніцай гісторыі, грамадазнаўства і геаграфіі Вялікакрапівенскага вучэбна-педагагічнага комплексу яслі-сад — базавая школа Касцюковіцкага раёна. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Аўтар больш за 20 метадычных публікацый. Узнагароджана нагрудным знакам Міністэрства адукацыі "Выдатнік адукацыі".*

gisdapamoga.bspu.by
gisdapamoga.bspu.by
gisdapamoga.bspu.by

## Ход урока

**I. Арганізацыйны этап.**

Настаўнік вітае вучняў, нагадвае, што яны прадаўжаюць вывучаць гісторыю беларускіх зямель у старажытныя часы. На папярэднім уроку яны даведаліся, калі беларускія землі пачалі засяляцца людзьмі, чаму каменны век атрымаў такую назву, якія былі заняткі старажытных людзей. На ўроку вучні даведаюцца, якім чынам старажытныя людзі вялі гаспадарку, якія ў іх былі прылады працы, якой была сістэма ўзаемаадносін і якія першыя творы мастацтва стваралі людзі ў старажытнасці.

З мэтай актуалізацыі ведаў вучням прапануецца запоўніць у табліцы "Старажытныя тыпы гаспадарак" першы слупок. У загаловак слупка вучні запісваюць тып гаспадаркі — прысвойвальная — і далей настаўнік арганізоўвае яе запаўненне па наступных пытаннях: *1. Што такое прысвойвальная гаспадарка? 2. У які час існавала? 3. Якія заняткі людзей былі галоўнымі ў гэты час? 4. Якімі прыладамі працы карысталіся людзі?*

*Табліца 1*

**Старажытныя тыпы гаспадарак**

| Тып гаспадаркі | Прысвойвальная гаспадарка | Вытворчая |
|---|---|---|
| Час існавання | | |
| Асноўныя заняткі людзей | | |
| Прылады працы | | |

*Настаўнік.* З цягам часу людзі навучыліся самі рабіць усё, што неабходна для жыцця. Яны прыручылі і гадавалі жывёл, вырошчвалі ядомыя расліны. *Успомніце, як называюцца гэтыя заняткі. З якога названага занятку развілася жывёлагадоўля? Якія жывёлы чалавек прыручыў першымі? Які занятак садзейнічаў таму, што чалавек змог перайсці да земляробства? (**Адказы.** Жывёлагадоўля, земляробства. З палявання. Сабака, каза, авечка, свіння і інш. Збіральніцтва.)*

Жывёлагадоўля і земляробства адносяцца да новага тыпу гаспадарчай дзейнасці першабытных людзей, якія мы і будзем вывучаць на ўроку. Напрыканцы ўрока мы параўнаем прысвойвальную гаспадарку з вытворчай і вызначым, якая з'яўлялася больш прадукцыйнай. У кожнага на сталах знаходзіцца схема "Змены ў новым каменным веку на беларускіх землях". Яна складаецца з трох асноўных блокаў — "Гаспадарка", "Грамадства", "Мастацтва". У прамавугольнікі, выдзеленыя пункцірам, замест пытальнікаў вы будзеце запісваць азначэнні некаторых паняццяў, вучэбную інфармацыю. Каб вам было лягчэй успрымаць матэрыял, яна часткова запоўнена. Каб запоўніць пустуючыя месцы, вам неабходна будзе чытаць вучэбны тэкст, аналізаваць яго, пасля неабходныя звесткі запісваць у схему *(гл. дадатак на с. 51)*.

**II. Аперацыйна-пазнавальны этап.**

***1. Як зарадзілася вытворчая гаспадарка.***

*Настаўнік.* Пачынаем запаўняць у схеме левую частку — "Гаспадарка". На падставе археалагічных даследаванняў вучоныя вызначылі тры перыяды каменнага веку: старажытны, сярэдні, новы каменны век. Звярніце ўвагу на стужку часу на с. 20 вучэбнага дапаможніка і знайдзіце храналагічныя рамкі новага каменнага веку. *(**Адказ.** 5—3 тыс. да н. э.)*

У гэты час фарміруецца новы тып гаспадаркі — вытворчая. Вучоныя так назвалі яе, таму што старажытны чалавек, апрача збіральніцтва і палявання, пачаў займацца яшчэ жывёлагадоўляй і земляробствам. Да гэтага вымушалі кліматычныя ўмовы. У левай частцы схемы "Гаспадарка" запішыце назву гаспадаркі — вытворчая — і яе характарыстыку — гаспадарка, пры якой людзі самі рабілі тое, што неабходна для жыцця *(гл. дадатак на с. 51)*.

Растлумачце, чаму менавіта жывёлагадоўля і земляробства паступова рабіліся асноўнымі заняткамі. Якія заняткі мелі другараднае значэнне? *(**Адказ.** Паляванне, збіральніцтва і інш.)* Як вы думаеце, якія наступствы меў пераход да вытворчай гаспадаркі? *(**Адказ.** Людзі змаглі назапашваць прадукты харчавання.)* 4. У які перыяд каменнага веку адбыліся гэтыя змены? *(**Адказ.** У новым каменным веку.)*

Паглядзіце на табліцу "Старажытныя тыпы гаспадарак". Якія дадзеныя трэба ў яе ўнесці? *(**Адказ.** Назву гаспадаркі — вытворчая. Час існавання — новы каменны век. Галоўныя заняткі — жывёлагадоўля, земляробства.)*

***2. З'яўленне жывёлагадоўлі.***

*Настаўнік.* Людзі ў старажытнасці актыўна займаліся паляваннем, бо гэта была адна з крыніц існавання. У час палявання яны калі-нікалі адлаўлівалі дзіцянят звяроў і пакідалі сабе. Згодна з археалагічнымі даследаваннямі жывёлагадоўля пачала фарміравацца на поўдні сучаснай тэрыторыі Беларусі, у новы каменны век, у 3-м тыс. да н. э. Паразважайце над пытаннямі:

*1. Якім чынам дзікія жывёлы сталі свойскімі для старажытнага чалавека? 2. Якіх жывёл ён прыручыў? 3. З якой мэтай ён гэта рабіў? 4. Дзе і калі на тэрыторыі Беларусі раней за ўсё з'явілася жывёлагадоўля?*

З пералічаных мною хатніх жывёл, вы назавіце, для чаго іх прыручыў старажытны чалавек: свіння, каза, карова, конь, вол, авечка, сабака.



gisdapamoga.bspu.by

У левай частцы схемы запішыце, калі пачала развівацца жывёлагадоўля (3 тыс. да н. э.), і жывёл, якіх прыручыў чалавек (напрыклад, сабака, каза, карова, конь, вол, свіння).

***3. Першыя земляробы.***

*Настаўнік.* Мы ўжо даведаліся, што такое вытворчая гаспадарка, з якой мэтай і для чаго чалавек у старажытнасці пачаў займацца жывёлагадоляй. Земляробства — яшчэ адзін з асноўных заняткаў людзей у старажытнасці. Прачытайце п. 3 "Першыя земляробы" *(вучэбны дапаможнік, с.29)*, назавіце, чым займаліся земляробы.

Пасля чытання тэксту вучэбнага дапаможніка вучням прапануецца завяршыць сказы.

1. Земляробства ўзнікла адначасова з жывёлагадоўляй, г. зн. у ... . ***(Адказ.** 3 тыс. да н. э.)*
2. На тэрыторыі Беларусі земляробства стала развівацца на ... . ***(Адказ.** Поўдні Беларусі (Палессі). (Вучні знаходзяць гэтую тэрыторыю на карце "З'яўленне людзей на тэрыторыі Беларусі", с. 17.)*
3. Спачатку апрацоўка зямлі ажыццяўлялася з дапамогай ... . ***(Адказ.** Матыкі.)*
4. Такое земляробства называецца ... . ***(Адказ.** Матычнае.)*
5. На Беларусі матычнае земляробства амаль не распаўсюдзілася, таму што было шмат ... . ***(Адказ.** Лясоў.)*
6. Ляда, або падсека, — гэта ... . ***(Адказ.** Участак, на якім высякаўся лес.)*
7. Падсечна-агнявое земляробства — гэта форма земляробства, пры якой ... . ***(Адказ.** Высякаўся і спальваўся на пэўным участку лес, карчаваліся пні, а попел служыў угнаеннем.)*
8. Для ўзрыхлення глебы выкарыстоўвалі драўлянае ... . ***(Адказ.** Рала.)*
9. Баранавалі поле бараной- ... . ***(Адказ.** Сукаваткай.)*
10. Ворыўнае земляробства — гэта від земляробства, пры якім для апрацоўкі зямлі выкарыстоўвалі ... і ... . ***(Адказ.** Рала і саха.)*
11. Ураджай збажыны зжыналі з дапамогай ... . ***(Адказ.** Сярпа.)*
12. Асноўныя земляробчыя культуры ў Беларусі — гэта ..., ..., ..., ... . ***(Адказ.** Ячмень, жыта, проса, лён.)*

*Настаўнік.* Пасля схемы "Змены ў новым каменным веку на беларускіх землях" у вас змешчаны лагічны ланцужок "Віды земляробства", запоўніце яго і растлумачце.

Запішыце ў схему віды земляробства (матычнае, ляднае (падсечна-агнявое), ворыўнае), чым апрацоўвалі зямлю (матыка, рала, барана-сукаватка). Разгледзьце ілюстрацыі на с. 29, 30 вучэбнага дапаможніка і выкажыце здагадку, ці лёгка было з такімі прыладамі працы апрацоўваць зямлю?

**Віды земляробства**




У запоўненым стане блок "Гаспадарка" выглядае наступным чынам:




*Настаўнік.* Звярніце ўвагу на табліцу "Старажытныя тыпы гаспадарак". Якіх звестак у ёй не хапае? ***(Адказ.** Звестак пра прылады працы, што выкарыстоўваліся ў вытворчай гаспадарцы — матыка, рала, саха, барана-сукаватка. Гэтыя звесткі запісваюцца ў табліцу.)*

Параўнайце два тыпы гаспадарчай дзейнасці першабытных людзей — прысвойвальную і вытворчую. Пералічыце адметнасці кожнага тыпу гаспадарання *(гл. табліцу 2 на с. 52)*.

***4. Як узнікла няроўнасць у грамадстве.***

Пытанне даволі складанае для засваення вучнямі, і таму неабходна з апорай на атрыманыя веды патлумачыць, як адбываўся працэс падзелу грамадства, шляхам лагічных разважанняў, выяўлення прычынна-выніковых сувязяў на структурна-лагічнай схеме.

*Настаўнік.* Вывучыўшы заняткі людзей у новым каменным веку, мы будзем працаваць з блокам 2 — "Грамадства" схемы "Змены ў новым каменным веку на беларускіх землях". Нагадаю вам, што ў старажытнасці сфарміравалася адна з форм арганізацыі людзей — родавая аб-



gisdapamoga.bspu.by

*Табліца 2*

**Старажытныя тыпы гаспадарак**

| | | |
|---|---|---|
| **Тып гаспадаркі** | Прысвойвальная гаспадарка — такі тып гаспадаркі, пры якім старажытны чалавек браў ад прыроды ўсё для жыцця ў гатовым выглядзе. | Вытворчая гаспадарка — тып гаспадаркі, пры якім людзі самі выраблялі тое, што неабходна для жыцця. |
| **Час існавання** | Каменны век, 100 тыс. гадоў да н. э. — канец 3-га тыс. да н. э. | Новы каменны век (5—3 тыс. да н. э.) |
| **Асноўныя заняткі людзей** | Збіральніцтва, паляванне, рыбалоўства. | Жывёлагадоўля, земляробства |
| **Прылады працы** | Востраканечнік, дзіда, скрабок, разец. | Матыка, рала, саха, барана-сукаватка |

шчына. Звярніце ўвагу на схему. Вы бачыце, што родавая абшчына — гэта група родзічаў, якія вялі агульную гаспадарку і сумесна валодалі прыладамі працы. Спачатку ўсе, хто ў яе ўваходзіў, былі родзічамі.

Першапачаткова ў абшчыне была калектыўная ўласнасць на ежу і на ўсю здабычу палявання і рыбалоўства. Размяркоўваліся яны ўраўняльна. Аднак з цягам часу сітуацыя змянілася. Паглядзіце на схему і растлумачце, што паўплывала на змены ў родавай абшчыне? *(**Адказ.** Пераход да земляробства і жывёлагадоўлі выклікаў неабходнасць будаўніцтва сховішчаў для ўраджаю, хлявоў для жывёлы, умацаванняў для абароны ад хцівых суседзяў.)* Якія наступствы гэта мела для абшчыны? *(**Адказ.** Вылучыліся спецыяльныя людзі — старэйшыны і правадыры.)* Старэйшыны і правадыры атрымалі права распараджацца маёмасцю абшчыннікаў. Гэта дазволіла ім багацець. У абшчыне з'явіліся бедныя і багатыя сем'і. Што пачало адбывацца ў родавай абшчыне? *(**Адказ.** Пачалося расслаенне грамадства.)*

Багатыя абшчыннікі не жадалі аддаваць сваю маёмасць і імкнуліся распараджацца ёю па ўласным жаданні: абменьваць, дарыць, пакідаць у спадчыну. Паглядзіце на схему і скажыце, якая форма ўласнасці з'явілася ў абшчыне? *(**Адказ.** Прыватная ўласнасць.)*

Асобныя абшчыны і плямёны станавіліся багацейшымі за іншыя. Гэта прыводзіла да ваенных канфліктаў. У час войнаў захоплівалі палонных, якія станавіліся рабамі. Іх выкарыстоўвалі для працы ў гаспадарцы багатых родзічаў, у першую чаргу старэйшын і правадыроў. Да рабоў ставіліся як да членаў сям'і. Гаспадары і палонныя жылі пад адным дахам і выконвалі тую ж працу, што і свабодныя члены абшчыны. Такую форму рабства назвалі патрыярхальным (хатнім) рабствам.

Вы паслухалі расказ пра ўладкаванне родавай абшчыны ў новым каменным веку. Што вам засталося незразумелым?




***5. Першыя прыклады мастацтва.***

*Настаўнік.* Нам засталося запоўніць трэці блок у схеме — "Мастацтва" .

Успомніце, што такое скульптура? Калі яна з'явілася? Каго малявалі старажытныя мастакі?

На тэрыторыі Беларусі былі знойдзены статуэткі мужчын каля возера Вячэра Любанскага раёна, паселішча Юравічы Калінкавіцкага раёна, вёскі Асавец Бешанковіцкага раёна. Разгледзьце на с. 33 вучэбнага дапаможніка знойдзеныя археолагамі мастацкія творы і падумайце, з якой мэтай выкарыстоўваліся такія рэчы? Якія ўпрыгажэнні ў выглядзе амулетаў выраблялі ў старажытнасці? Для чаго выраблялі амулеты? *(**Адказ.** Людзі верылі, што яны засцерагалі іх уладальнікаў ад небяспекі.)* Разгледзьце ілюстрацыі з керамічным посудам на с. 25, 33, 34 вучэбнага дапаможніка і вызначыце, што змянілася ў аздабленні посуду ў новым каменным веку? *(**Адказ.** Яго ўпрыгожыў арнамент.)* *(Пасля абмеркавання ілюстрацый настаўнік прапаноўвае вучням запоўніць блок "Мастацтва", гл. с. 53).*

gisdapamoga.bspu.by




**III. Этап замацавання вывучанага матэрыялу.**

*Настаўнік.* На ўроку мы склалі схему "Змены ў новым каменным веку на беларускіх землях". Што для вас незразумела ў гэтай схеме? *(Заслухоўваюцца адказы вучняў.)* Каб праверыць свае веды пісьмова выканайце тэст.

**Тэст**

**I. Вызначыце, што адносіцца да вытворчай гаспадаркі, што да патрыярхальнага рабства.**

А. Вытворчая гаспадарка.
Б. Патрыярхальнае рабства.
В. Родавая абшчына.
1. Група людзей, якія вялі агульную гаспадарку і сумесна валодалі прыладамі працы.
2. Гаспадарка, пры якой асноўнымі заняткамі з'яўляюцца земляробства і жывёлагадоўля.
3. Першапачатковая форма рабства.
***(Адказ.** А 2; Б 3; В 1.)*

**II. Вызначыце, што адносіцца да матычнага, ворыўнага і падсечна-агнявога земляробства.**

Матыка, саха, рала, барана-сукаватка.
***(Адказ.** Матычнае земляробства — матыка; падсечна-агнявое земляробства — барана-сукаватка; ворыўнае земляробства — рала, саха.)*

**III. Упішыце прапушчаныя ў сказе словы і даты:**

На тэрыторыі Беларусі жывёлагадоўля і земляробства з'явіліся ў перыяд ... каменнага веку, у ... тыс. да н. э., на ... краіны.
***(Адказ.** Новага, 3 тыс. да н. э., поўдні.)*

**IV. Пастаўце ў лагічнай паслядоўнасці падзеі:**

1. З'яўленне земляробства і жывёлагадоўлі.
2. Фарміраванне патрыярхальнага рабства.
3. Вылучэнне старэйшын і правадыроў.
4. Расслаенне грамадства.
5. Назапашванне лішкаў харчавання.
6. З'яўленне прыватнай уласнасці.
7. Узнікненне войнаў.

***(Адказ.** 1; 5; 3; 4; 6; 7; 2.)*

**V. Як вы лічыце, з якой мэтай першабытныя людзі наносілі арнамент на гліняны посуд?**

Настаўнік правярае тэст, прапаноўвае вучням пералічыць, што яны вывучылі на ўроку.

**IV. Этап інфармавання пра дамашняе заданне.**

Прачытаць § 2, адказаць на пытанні і заданні на с. 34 вучэбнага дапаможніка. Выканаць у рабочым сшытку заданні 2, 3, 8 (с. 12-13, 15).

gisdapamoga.bspu.by